# СУЧАСНЫ ЛЕКАР І РЭЛІГІЯ

***Кабішава Феафанія Дзмітрыеўна, Рэспубліка Беларусь***
*Беларускі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт,*
*Рэспубліка Беларусь, г.Мінск*
*Навуковы кіраўнік – ст.выкладчык Носік А.А.*

*Анатацыя.* У артыкуле закранаецца роля духоўнага складніка ў працэсе лячэння. Разглядаюцца магчымасці звароту да праваслаўных рэлігійных поглядаў на сутнасць хваробы і працу лекара, прыводзяцца прыклады біблейскіх тэкстаў па дадзенай тэме.

*Ключавыя словы: рэлігія, медыцына, Біблія, праваслаўе.*

Вялікі ўклад у развіццё медыцыны ў свой час зрабілі такія людзі як Гіпакрат, Гален, Авіцэна. Гіпакрат вялікае значэнне надаваў этычнаму і маральнаму бакам медыцыны, Гален – фізічнаму боку [1, с. 1–2]. У любым выпадку, чытаючы, напрыклад, клятву Гіпакрата, можна ўбачыць, што яго прафесія не проста ўплывае на ўсё яго жыццё, але нават паглынае яго.

Эвалюцыянаванне чалавека і неабходнасць прыстасоўвацца да розных умоў навакольнага асяроддзя кіруюць яго паводзінамі ў мэтах забеспячэння вітальных і сацыяльных патрэб. У дадзеных умовах вырастае роля камунікацыі, якая, акрамя выканання сваіх прафесійных абавязкаў, патрабуе няўхільнага прытрымлівання норм маралі і прынцыпаў духоўнасці. А гэта і ёсць неад’емная частка прафесіі лекара. Спраўляцца з праблемамі не вучаць – гэта проста складана, нават немагчыма, – бо мала сказаць “будзь добрым”, трэба падаць прыклад, і нават гэтага можа быць недастаткова. Таму мяркуецца, што маральныя якасці лекар мае па змаўчанні. Вось і атрымліваецца, што хтосьці кіруецца раўнадушшам і халоднасцю, хтосьці модай, хтосьці эзатэрыкай, хтосьці выпадковасцю, і ў выніку ўсё гэта адбіваецца на чужым незнаёмым чалавеку – пацыенце. Як пасля гэтага падняць узровень даверу насельніцтва да аховы здароўя, як дапамагчы лекару дапамагаць іншым?

За вырашэннем любога пытання мы звяртаемся туды, у што мы верым, дзе ёсць правільны адказ. Для беларускіх медыкаў гэта часта зварот да праваслаўя. Што ж можа прапанаваць 2024-гадовая рэлігія? Калі сцісла, то дапамогу, увагу, прыклад, параду, узнагароду і галоўнае – сэнс. Напрыклад, хто такі лекар, на думку праваслаўя? Для адказу на гэта пытанне трэба першапачаткова вызначыць, хто такі Бог: Суддзя, Творца, Айцец, Уседасканалы Дух і, у строгім багаслоўскім ўжыванні, Бог – Лекар [2]. У такім выпадку, Хто, як не Калега зразумее медыка і з Каго, як не з Уседасканалага браць прыклад? Менавіта зносіны з Богам і следаванне яго прадпісанням прапануе праваслаўе.

Для дасягнення гэтых мэт праваслаўе выкарыстоўвае Пісанне, Паданне і аўтарытэт сучаснай Царквы. Пісанне – гэта ўся Біблія, усе кнігі Старога і

Новага Запаветаў. Пад Паданнем разумеюць усю сукупнасць пісьмовых і вусных крыніц, пры дапамозе якіх хрысціянская вера перадаецца з пакалення ў пакаленне [3]. Царква – не толькі месца правядзення службаў, у першую чаргу – гэта ўсе праваслаўныя людзі.

У Біблii можна знайсці парады, напрыклад: “Шануй лекара гонарам па патрэбе ў ім; бо Гасподзь стварыў яго, і ад Вышняга лекаванне... Гасподзь стварыў з зямлі лякарства, і разважлівы чалавек не будзе грэбаваць ім. Дзеля таго Ён і даў людзям веданне, каб праслаўлялі Яго ў цудоўных дзеях Ягоных: імі Ён лечыць чалавека і знішчае хваробу ягоную. Падрыхтоўвае лекар лекі робіць з іх сумесь, і заняткі яго не канчаюцца, і праз яго бывае карысць на твары зямлі. Сын мой! У хваробе тваёй ня будзь нядбайны, але маліся Госпаду і Ён ацаліць цябе. Пакінь грахоўнае жыццё, і выпраў рукі твае, і ад усякага грэху ачысці сэрца... і дай месца лекару, бо і яго стварыў Гасподзь, і хай не аддаляецца ён ад цябе, бо ён патрэбны. У іншы час і ў іх руках бывае поспех. Бо і яны моляцца Госпаду, каб Ён дапамог ім падаць хвораму палёгку і вылячэнне да працягу жыцця” (Сір.38:1–2,4:6–10,12–14).

Вядома, яркай рысай Бібліі з’яўляецца багацце прыкладаў паводзін і дзеянняў. Гасподзь Ісус Хрыстос вылечваў многія хваробы, можна ўспомніць хаця б вылячэнне пракажонага. Праказа прыносіць павольную смерць, адпадзенне пальцаў, дэфармацыю вонкавага выгляду, выродлівасць. З-за заразнасці захворвання закон Маісееў загадваў выдаляць хворых з сем’яў за мяжу паселішча, і пры сустрэчы са здаровым чалавекам яны павінны былі здалёку крычаць яму: “Нячысты, нячысты”. Людзі маглі лічыць, што чалавек захварэў, таму, што зрабіў нешта дрэннае, што гэта такое пакаранне, таму да цяжару захворвання дадавалася яшчэ і адхіленасць ад грамадства. Ісус Хрыстос, як Гасподзь самога Закона, насуперак літары гэтага Закона, дакрануўся да пракажонага і ацаліў яго, гэтым паказаўшы, што не чалавек для закона, а закон для чалавека [4]. Бо не заўсёды лекару лепш дзейнічаць па інструкцыі, бываюць такія выпадкі, калі сітуацыя патрабуе змяніць план дзеянняў. Гэта не значыць, што інструкцыя дрэнная, проста каму, як не лекару разумець, што ў дадзенай сітуацыі лепш для пацыента, паколькі менавіта ўсебаковая дапамога хвораму і з’яўляецца галоўнай мэтай працы лекара, а не толькі прытрымліванне інструкцыі.

У Біблii таксама можна знайсці словы суцяшэння. Кожны знойдзе свае. Суцяшэнне і разуменне яшчэ можна знайсці і ў Царкве, у людзей. Шмат прыкладаў жыцця лекараў можна знайсці ў Паданні. Тут і свяціцель Лука Война-Ясянецкі, і лекар Панцеляймон, і бяссрэбранікі Касма і Даміян, Матрона Маскоўская і іншыя святыя лекары [5]. На іх прыкладах можна вучыцца. Праваслаўе таксама дае магчымасць зносін з імі праз малітву, – бо “ў Бога ўсе жывыя” (Лк.20: 38), як паведамляе нам Пісанне і гэта дае надзею на выратаванне ад пакут. Трэба сказаць і пра развіццё станоўчых якасцей чалавека: дабрыні, цярпення, любові, разважлівасці, уседлівасці і працавітасці. Добры не той, хто добры сам па сабе, а той, хто мае звычку быць добрым. У

Царкве нікому не дадуць забыцца пра самаўдасканаленне, бо большая частка жыцця ў Ёй пабудавана на актыўных дзеяннях і пастаянным напамінку і матываванні.

Такім чынам, можна зрабіць высновы, што медыцына моцна звязана з рэлігіяй і, як і любому чалавеку, лекару нічым не нашкодзіць час ад часу звяртацца да меркавання Праваслаўнай Царквы, а кіраўніцтва гэтым меркаваннем толькі спросціць жыццё і дапаможа зрабіць правільны, не заўсёды просты выбар.

Літаратура:

1. Худошин, А. С. Мои беседы с православными врачами / А. С. Худошин. – М.: Благовест, 2004. – 384 с.

2. Врач [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://azbyka.ru/vrach. – Дата доступу: 17.09.2024.

3. Священное Писание и Священное Предание: православный взгляд [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://azbyka.ru/svyashhennoe-pisanie-i-svyashhennoe-predanie-pravoslavnyj-vzglyad. – Дата доступу: 17.09.2024.

4. Святое Евангелие от Матфея с толкованием Святых Отцов (Троицкие листки №№ 801–1050) [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://azbyka.ru/otechnik/Nikon_Rozhdestvenskij/svjatoe-evangelie-ot-matfeja-s-tolkovaniem-svjatykh-ottsov-troitskie-listki/29#source. – Дата доступу: 17.09.2024.

5. Святые целители [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://azbyka.ru/zdorovie/svyatye-celiteli. –Дата доступу: 17.09.2024.